яшчэ „членам буржуазнай *дэмакратычнай* партыі“. У гэтым азначэньні тлумачальнага слоўніка слова *„дэмакратычнай“* выразна саступае паводле экспрэсіі слову „буржуазнай“. Да таго ж першыя пазытыўныя *дэмакраты* хутка станавіліся злодзеямі — *дэмакрат* Гарбачоў разваліў краіну, Шушкевіч яму дапамагаў, а таксама будаваў лецішча *маладэмакратычным* шляхам — нібыта краў цьвікі.

Цяпер сярод беларусаў ёсьць *нацыянальныя дэмакраты*, *хрысьціянскія дэмакраты*, *сацыяльныя дэмакраты* і *лібэральныя дэмакраты*. Усе абсалютна розныя, але павязаныя адной мэтай — хутчэй гэтую *дэмакратыю* аднавіць.

# Дэмбель

***Рыгор Барадулін***

Кепскі той салдат, што зь першага дня службы ў арміі пра *дэмбель* ня думае, бо ў бацькоў-камандзіраў адна задача — каб служба раем не здалася.

*Дэмбель* — гэта дэмабілізацыя, дзень, калі падпісваюць загад аб сканчэньні службы ў войску. Тыя, хто падлягаюць *дэмбелю*, адлічваюць кожны дзень, і паўсюль, дзе можна, і нажамі выразаюць, а цяпер і флямастэрамі пішуць, колькі засталося да *дэмбелю*.

*Дэмбелянты* — гэта „старыя“, а маладое папаўненьне — „салагі“. *Дэмбелянт* загадзя рыхтуецца да чаканага дня, мяняе ўсё на новае — ад рэменя да чаравікаў.

„Салагі“ паслугоўваюць „старым“. Любяць *дэмбелянты* розныя фантазіі — ляжыць *дэмбелянт*, прыкладам, на койцы, а „салагі“ марудна нясуць койку й ціха пагойдваюць, а іншыя махаюць над ім галінамі — гэта *дэмбелянт* плыве ў *дэмбель*.

*Дэмбелянтаў* звычайна ня дужа загружаюць працаю. Праўда, калі патрапіць у няласку, начальства можа *дэмбель* падпісаць 31 сьнежня ўвечары або 1 студзеня. Сьвяткуй тады навагоднюю ёлку зь мядзьведзем, калі ён яшчэ дзе ацалеў.

Слова *дэмбель* грэе салдата спадзевам.

# Дэфіцыт

***Сяргей Харэўскі***

Колькі існуе цывілізацыя, гэтулькі ж існуе і *дэфіцыт*. Пра гэта сьведчыць і рымскае паходжаньне самога слова — брак, недахоп, нястача чаго-небудзь — прыкрыя, неадступныя спадарожнікі чалавецтва. Але ў лаціне яно гучыць як афіцыйнае паведамленьне: *„дэ-фі-цыт“*. Як непазьбежнасьць.

У савецкі час *дэфіцытам* магло стаць што заўгодна: ад кніг і чорнай ікры (чаму былі свае тлумачэньні) да невытлумачальнага *дэфіцыту* цукру ці гаспадарчага мыла. *Дэфіцытам* пачалі называць самі тавары, якіх бракавала. Гэтае слоўца было на вуснах у кожнага беларуса: *„выкінулі дэфіцыт“*, на прылаўку зьявіўся рэдкі тавар — *„знайшоў дэфіцыт“*, *„ухапіў дэфіцыту“*, *„якіх бы дэфіцытаў да стала“*.

Каб разьмяркоўваць савецкія *дэфіцыты* пароўну, была і адмысловая фор-